View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



**Н.В. Заяц (Мінск)**

# Эпісталярныя формы ў творах Максіма Гарэцкага: ідэйна-зместавы і функцыянальны аспекты

Вядомая яшчэ з часоў антычнасці і дастаткова шырока распаўсюджаная ў сусветным слоўным мастацтве эпісталярная форма аповеду знайшла ўвасабленне ў многіх творах Максіма Гарэцкага. Прыём ліставання і форма пісьма аказаліся найбольш прыдатнымі для перадачы шуканняў рэфлексійнага героя – аб’екта даследавання беларускага аўтара. Эпісталярныя фрагменты паслядоўна выкарыстоўваюцца пісьменнікам і ў творах, галоўным героем якіх выступае Лявон Задума: аповесцях “У чым яго крыўда?”, “Меланхолія” і, часткова, запісках “На імперыялістычнай вайне”, дзе паспяхова апрабаваная форма выцясняецца блізкай, але прынцыпова іншай паводле мастацкіх функцый і задач – дзённікавай. Форма ліста, як і дзённіка, скіравана на ўнутраны свет асобы, але ў адрозненне ад апошняй выяўляе героя ў меншай ступені інтравертнага. Арыентацыя на адрасата (а гэта і ёсць апазнавальная прыкмета эпісталярнай літаратуры) сведчыць пра імкненне адрасанта (героя твора) кантактаваць, пра яго патрэбу ў камунікацыі. Нягледзячы на “самакапанні” і засяроджанасць на ўласных перажываннях, у аповесцях Лявон Задума адкрыты свету і шукае сваё месца ў ім. У першай кнізе трылогіі душэўныя ваганні героя раскрываюцца ў лістах-рэфлексіях да сябра Максіма, якія выяўляюць яго жыццёвую філасофію, перадаюць разуменне няпэўнага становішча інтэлігента-неафіта ў тагачасным соцыуме: “...Мы галуемся на чужым грунце і забываемся добра разумець свой уласны грунт. <...> А то мы не ведаем, у чым паэзія нашага жыцця, хараство нашага жыцця. Бо што ж? – Тое лепшае, чалавецка-беларускае, што ўзгадавала ўва мне сям’я <...>, тое даўгі час выкараняла ўва мне расійская школа. Ну ці ж навучыла мяне школа любіць сваё беларускае, даражыць хараством роднае прыроды, праняцца гармоніяй родных з’яў? Чаму нас вучылі?

Во і вісі паміж неба і зямлі. Ці рві з душы роднае карэнне і адракайся роднае хаты, ці ўцякай ад панскай вопраткі і цягайся за прымітыўнаю дзядоўскаю сахою” [1, с. 173] (“У чым яго крыўда?”). Вучань сельскагаспадарчай школы імкнецца прымірыць у сабе дзве па сутнасці варожыя культуры – беларуска-сялянскую і расійска-панскую, пазбавіцца душэўнай раздвоенасці. На нейкі момант Лявону падаецца, што згладзіць гэтую супярэчнасць яму дапаможа каханне да простай вясковай дзяўчыны, аднак гэтая надзея аказваецца падманнай.

Думаецца, нягледзячы на наяўнасць знешняга, падзейнага сюжэта (герой аповесцяў увесь час знаходзіцца ў руху, перамяшчаецца на вялікія адлегласці), эмацыйная напружанасць, высокая ступень экспрэсіўнасці твораў, іх унутраная дынаміка закладзена найперш у лістах, дзе пачуцці выяўляюцца ў натуральным, першасным выглядзе. Дзякуючы эпісталярнай форме, якая перадае “непатрывожанае” аўтарскім “умяшальніцтвам”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

унутранае жыццё персанажаў і ў першую чаргу – Лявона Задумы, ствараецца ілюзія сапраўднасці, нявыдуманасці гісторый. М. Гарэцкі адыходзіць на другі план, даючы магчымасць героям дзейнічаць самастойна.

Так, заключная частка аповесці “У чым яго крыўда?” увогуле ўяўляе з сябе падборку лістоў, звязаных кароткімі аўтарскімі рэмаркамі. Лісту ўласціва выбіральнасць: фіксуюцца не ўсе падзеі / эмоцыі, а толькі тыя, што маюць найбольш важнае значэнне для адрасанта. Менавіта таму ў мастацкім тэксце форма пісьма дазваляе аўтару перадаць сутнасную, характарыстычную інфармацыю, пазбягаючы залішніх тлумачэнняў, не абцяжарваючы тэкст другараднымі дэталямі. Прыведзеныя ў фінале пісьмы – ад Лёксы, ад бацькоў з узрушанай Лаўрынькавай прыпіскай, паштоўка ад сябра, ліст Лявона да брата – красамоўна перадаюць перажыванні і стан усіх удзельнікаў адначасова недарэчнай і драматычнай падзеі, завязкай якой таксама паслужыла пісьмо – закаханага юнака: “Ці здарова ты, мая даражэнькая, мая любенькая, мая прыгожанькая Лёксачка?

Ах, чаму я гэтакі шчаслівы, што спазнаўся з табою, Лёксачка мая, і нешчаслівы, што жыву так далёка-далёка? Здаецца, кінуў бы тут, рынуў усё чыста і паляцеў бы да свае Лёксачкі хоць на адну-адну хвіліначку. <...>

Ну, а затым і аставайся здаровенька, мая красачка, мая журавіначка! Цалую цябе, Лёксачка, на ўсю сілу. Абхапіўшы за шыйку, жалею, мілую на ўсю сілу. Люблю цябе, люблю! Лёксачка любая! Лёкса, Лёксачка!” [1, с. 170–171] (“У чым яго крыўда?”).

Эпісталярная форма як найлепш падыходзіць для таго, каб стварыць маўленчыя, а праз яго і асабістыя партрэты персанажаў – хлопца і дзяўчыны, акрэсліць іх інтэлектуальна-духоўны ўзровень і сацыяльны статус. Персанажы “самастойна”, без бачных аўтарскіх захадаў паказваюць тую вялізную прорву, што аддзяляе іх адно ад аднаго, больш за тое – падкрэсліваюць немагчымасць прымірэння дзвюх цывілізацый. Яны (цывілізацыі) чужародныя і несумяшчальныя, як антаганістычныя і несумяшчальныя стылі двух пісем: рамантычна-інтымны Лявонавага і прымітыўна-рытарычны Лёксінага. Адказ дзяўчыны, напісаны сяброўкай, бо сама яна няг255граматная, – гэта набор расхожых банальнасцяў і штампаў, за якімі няма нічога асабістага: “Рука мая пісала, не ведала – каму, а сэрцайка сказала, што міламу свайму. Пішу пісьмо ад скукі, ляці, пісьмо, майму міленькаму ў рукі. Пісьмо ад вашай Сашы драгацэннаму другу Лявонцію Грыгорьевічу Задумаву. У першых строках маяво пісьма паклон ад белага ліца аж да сырой матушкі зямлі. І яшчэ звяшчаю вас, што мы, ваша Саша, жывы і здаровы і вам таво жалаім ад господа і бога, здароўя і ўсякага ўспеху ў дзелах рук вашых” [1, с. 184] (“У чым яго крыўда?”).

Ліст дзяўчыны ацвярэзіў Лявона, пазбавіў яго ідылічнай мроі не толькі пра асабістае шчасце са “слаўнай дзяўчынкай” з роднага Цёмналесся, але і паказаў марнасць спадзяванняў іншага гатунку – культурна-сацыяльнага. Любоўнае расчараванне яшчэ больш заблытала думкі Лявона, урэшце прывяло яго да глабальнага расчаравання – у жыцці ўвогуле, да меланхоліі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Другая аповесць прысвечана даследаванню змрочнага, прыгнечанага стану, у якім апынуўся Лявон Задума пасля заканчэння сельскагаспадарчай школы, псіхалагічна тонкаму паказу зрухаў душы героя. Па словах М.І. Мушынскага, “«Меланхолія» прадэманстравала відочныя поспехі аўтара ў авалоданні сакрэтамі пабудовы сацыяльна-псіхалагічнай аповесці. Напоўнены глыбокім філасофскім зместам, роздумамі героя, схільнага да рэфлексіі, да тонкіх перажыванняў, твор пазбаўлены, аднак, статыкі, апісальнасці. Сюжэт яе дынамічны. Але заснаваны ён не на голай падзейнасці, не на дэтэктыўных калізіях і сітуацыях, а на руху думак і пачуццяў героя” [2, с. 406]. Як і ў папярэднім творы, “рух думак і пачуццяў героя” ў “Меланхоліі” раскрываецца найперш пасродкам лістоў, адрасаваных Максіму (пачатковая частка так і называецца – “Сумныя лісты”). Малады чалавек шукае падтрымкі, чакае парады ад сябра, у якім бачыць аднадумцу. Цікава, што Максімавых адказаў аўтар не змяшчае, і гэта ўяўляецца невыпадковым – так падкрэсліваецца экзістэнцыяльная адзінота героя: нават нягледзячы на існаванне сяброў і дарадцаў, чалавек заўсёды прымае рашэнне сам, адзін. Разам з тым магчымасць звароту да адрасата дае ўяўнае адчуванне не-адзіноты, ліст выконвае функцыю псіхалагічнай разгрузкі – герою становіцца святлей на душы, пра што ён і гаворыць у апошнім допісе: “Напісаў табе і быццам трохі супакоіўся, агледзеўся, абдумаўся, нібы троху і павесялела” [1, с. 195] (“Меланхолія”).

Калі ў аповесцях эпісталярныя формы прадстаўлены вельмі шырока, то ў запісках “На імперыялістычнай вайне” змешчана толькі адно пісьмо – фельчара Сямёна Лябёдкіна да Лявона Задумы (апошняя частка твора “Ліст”). Допіс саслужыўца ўяўляе з сябе своеасаблівы постскрыптум-эпілог: распавядае пра франтавыя падзеі, якія аказаліся “за кадрам” для Лявона. Форма ліста арганічная для твора, напісанага ў жанры дзённіка. І дзённіку, і эпісталярыю ўласціва суб’ектыўнае ўспрыняцце падзей, у той час як аўтарскі погляд прэтэндуе на іх больш-менш аб’ектыўную, старонняю ацэнку. Магчыма, праяўленасць асобы пісьменніка пазбавіла б мастацкай ілюзіі пра аўтэнтычнасць запісак, пра тое, што яны належаць рэальнаму чалавеку, а не літаратурнаму персанажу. Ліст жа дазволіў зрабіць твор завершаным у зместавa-ідэйным плане, не разбураючы стылёвага адзінства.

Такім чынам, эпісталярныя формы, выкарыстаныя ў трылогіі, выконваюць розныя функцыі: выступаюць найбольш адэкватным спосабам перадачы рэфлексій галоўнага героя, дазваляюць без дадатковых тлумачэнняў даць маўленчую, а праз яе – асобасную і сацыяльную характарыстыку персанажаў, выяўляюць падкрэслена суб’ектыўную рэцэпцыю свету. Прыём ліставання і разнастайныя формы ліста працуюць на псіхалагічную дакладнасць у раскрыцці характару, сведчаць пра выключнае майстэрства М. Гарэцкага як пісьменніка-псіхолага, мастака філасофскага складу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Спіс літаратуры

1. Гарэцкі, М. Творы : апавяданні, аповесці / М. Гарэцкі ; уклад. з тэксталаг. падрыхт. Т. Голуб ; прадм. М. Кенькі. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 446 с.
2. Мушынскі, М.І. Максім Гарэцкі / М.І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск : Бел. навука, 1999–2003. – Т. 1 : 1901–1920 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – 3-е выд. – 2003. – С. 381–426.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ